УДК [821.161.3+821.162.1]:94(47)“1830/1831”-055.2

# Вобраз Эміліі Плятэр у мастацкай літаратуры

**Гладкова Г.А.**
*Установа адукацыі “Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава”, Віцебск*

*Артыкул прысвечаны даследаванню мастацкіх інтэрпрэтацый вобраза Эміліі Плятэр у літаратуры.*

*Мэта даследавання – на матэрыяле літаратурных твораў розных жанраў мастацкай літаратуры выявіць адметнасці індывідуальна-аўтарскай інтэрпрэтацыі асобы і дзейнасці ўдзельніцы Лістападаўскага паўстання 1830–1831 гг. Эміліі Плятэр.*

***Матэрыял і метады.** Матэрыялам для кампаратыўнага аналізу паслужылі творы беларускіх і польскіх пісьменнікаў (апавяданне Н. Мацейчык “Графіня”, верш А. Міцкевіча “Смерць палкоўніка”, раман В. Гансяроўскага “Эмілія Плятэр”). Метадалогія даследавання абумоўлена выкарыстаннем агульнанавуковых метадаў аналізу і сінтэзу, а таксама прыёмаў канкрэтна-гістарычнага метаду, метаду параўнальнага аналізу, герменеўтычнага метаду.*

***Вынікі і іх абмеркаванне.** Эмілія Плятэр не была адзінай прадстаўніцай жаночага полу ў радах паўстанцаў, аднак яе асоба набыла рысы міфалагізацыі, легенда пра дзяўчыну-воіна атрымала шырокае распаўсюджванне і ўвасабленне ў розных відах мастацтва. У прыватнасці, польскія і беларускія пісьменнікі асэнсоўвалі дзейнасць і ролю Э. Плятэр у розных жанрах (А. Міцкевіч “Смерць палкоўніка”, В. Гансяроўскі “Эмілія Плятэр”, Н. Мацейчык “Графіня” і інш.).*

***Заключэнне.** Кампаратыўны аналіз выбраных твораў мастацкай літаратуры дазваляе сцвярджаць, што асоба Эміліі Плятэр выклікала зацікаўленасць у пісьменніцкіх колах XX–XXI стст., аднак інтэрпрэтацыя рэальнай гістарычнай асобы адрозніваецца глыбінёй і дакладнасцю фактalогіі.*

***Ключавыя словы:** Лістападаўскае паўстанне 1830–1831 гг., гістарычная проза, жанр, мастацкі вобраз, ідэалізацыя, кампазіцыя, паэтыка, стыль.*

*(Ученые записки. – 2023. – Том 37. – С. 143–146)*

# The Image of Emilia Plater in Fiction

**Gladkova G.A.**
*Education Establishment "Vitebsk State P.M. Masherov University", Vitebsk*

*The article is devoted to the study of artistic interpretations of the image of Emilia Plater in fiction literature.*

*The purpose of the study is to identify the features of the individual author's interpretation of the personality and activities of the participant of the November Uprising of 1830–1831, Emilia Plater, based on the material of artistic works of different genres of Belarusian and Polish literature.*

***Material and methods.** The material for comparative analysis was the works of Belarusian and Polish writers (N. Matseichyk's short story “The Countess”, A. Mitskievich's poem “The Death of the Colonel”, V. Ganserovsky's novel “Emilia Plater”). The methodology of the research is determined by the use of general scientific methods of analysis and synthesis, as well as techniques of the concrete historical method, the method of comparative analysis, the hermeneutic method.*

***Findings and their discussion.** Emilia Plater was not the only female representative in the ranks of the rebels, but her personality acquired the features of mythologization; the legend of the warrior girl became widespread and embodied in various forms of art. In particular, Polish and Belarusian writers comprehended the activity and role of E. Plyater in different genres (A. Mitskievich “The Death of the Colonel”, V. Ganserovsky “Emilia Plyater”, N. Matseichyk “The Countess”, etc.).*

***Conclusion.** A comparative analysis of the selected works of fiction suggests that the personality of Emilia Plater aroused interest in the literary circles of the XX–XXI century, however, the interpretation of the real historical personality is distinguished by depth and accuracy of factual.*

***Key words:** November Uprising of 1830–1831, historical prose, genre, artistic image, idealization, composition, poetics, style.*

*(Scientific notes. – 2023. – Vol. 37. – P. 143–146)*

*Адрас для карэспандэнцыі:* ***e-mail: anngrin@mail.ru*** *– Г.А. Гладкова*

Эмілія Плятэр – вядомая асоба нацыянальнай гісторыі. Названая “беларускай Жаннай д’Арк”, яна пражыла кароткае жыццё, авеянае рамантыкай подзвігу ў імя айчыны. Біяграфічныя звесткі пра Э. Плятэр і сёння становяцца падставай для дыскусій наконт яе этнічнай прыналежнасці. Як вядома, Эмілія нарадзілася ў Вільні і паходзіла са старажытнага графскага роду з нямецкімі каранямі (па бацьку), а па мацярынскай лініі – з браслаўскай шляхты. Плятэры прытрымліваліся каталіцкага веравызнання, а не лютэранскага, што сведчыць пра ўваходжанне роду ў мясцовую этнічную супольнасць. Юнацтва паненкі прайшло ў наддзвінскай Ліксне (тагачасн. Віцебск. губ., сучасн. Літва) ў маёнтку дзядзькі Міхала Плятэра і яго жонкі Ізабэлы. З дзяцінства Эмілія была надзеленая моцным характарам, яе мала цікавілі жаночыя забавы. Захапленне подзвігамі Жанны д’Арк і Ласкарыны Бубуліны (гераіні грэчаскага паўстання ў 1821 г. супраць Асманскай імперыі) паўплывалі на сталенне дзяўчыны і ў некаторай ступені прадвызначылі яе лёс. Успаміны пра Э. Плятэр занатаваныя ў польскай, беларускай і рускай літаратурах, дзейнасці паненкі прысвечаны шэраг прац [1, с. 10–13]. Аднак грунтоўнага вывучэння мастацкага вобраза Эміліі Плятэр, які створаны ў беларускай і іншых літаратурах свету, не праводзілася.

Мэта даследавання – на матэрыяле мастацкіх твораў розных жанраў беларускай і польскай літаратуры выявіць адметнасці індывідуальна-аўтарскай інтэрпрэтацыі асобы і дзейнасці ўдзельніцы Лістападаўскага паўстання 1830–1831 гг. Эміліі Плятэр.

**Матэрыял і метады**. Матэрыялам для кампаратыўнага аналізу паслужылі творы беларускіх і польскіх пісьменнікаў (апавяданне Н. Мацейчык “Графіня”, верш А. Міцкевіча “Смерць палкоўніка”, раман В. Гансяроўскага “Эмілія Плятэр”), у якіх асэнсоўваецца дзейнасць гераіні Лістападаўскага паўстання 1830–1831 гг. У цэнтры даследчыцкай увагі – літаратурныя прыёмы, выкарыстаныя аўтарамі для стварэння мастацкага вобраза Э. Плятэр. Метадалогія даследавання абумоўлена выкарыстаннем агульнанавуковых метадаў аналізу і сінтэзу, а таксама прыёмаў канкрэтна-гістарычнага метаду, метаду параўнальнага аналізу, герменеўтычнага метаду.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Як адзначае беларуская даследчыца гістарычнай прозы Г.В. Навасельцава, *“зварот да гістарычна аддаленых часоў, выяўленне вечнага ў плыні часу вымагаюць шырокага ахопу мінулага. Для гэтага пісьменнікам выкарыстоўваюцца легендарныя і летапісныя крыніцы, пэўныя гістарычныя звесткі. Легендарная або летапісная асоба, набліжаная да сучаснікаў пісьменніка, гераізуецца і паэтызуецца, чалавечыя ўчынкі на гістарычным фоне асэнсоўваюцца як гістарычныя дзеі, ідэйна-эстэтычнай дамінантай асэнсавання мінулага выступае патрыятычны пафас, гераічная тэматыка выяўляецца як нацыянальна арыентаваная”* [2, с. 207]. Імя Эміліі Плятэр узгаданае на старонках шматлікіх гістарычных выданняў. Напрыклад, у падручніку па гісторыі Беларусі (М.А. Плавінскі, 2017) адносна Лістападаўскага паўстання 1830–1831 гг. адзначана: *“Адным з камандзіраў дзісненскіх паўстанцаў была Эмілія Плятэр, вобраз якой трывала ўвайшоў у беларускую літаратуру як сімвал дзяўчыны-змагаркі за незалежнасць”* [3, с. 61]. Беларускі гісторык В. Швед у грунтоўнай манаграфіі, прысвечанай гісторыі Беларусі XVIII–XIX ст. ст., адносна дзейнасці Э. Плятэр зазначаў: *“29 сакавіка ў м. Дусяты Віцебскай губ. падняла паўстанне Э. Плятэр, якая за кароткі час здолела арганізаваць партызанскі атрад колькасцю ў 280 стралкоў, 60 коннікаў і некалькі соцен касінераў”* [4, с. 315]. Пісьменнік У. Арлоў заўважаў пра Э. Плятэр: *“Характарам, тэмпераментам, ахвярнасцю яна вельмі нагадвала сваю сястру па духу з пачатку XX стагоддзя – Алаізу Пашкевіч (Цётку)”* [5, с. 36].

У беларускай літаратуры дзейнасць знакамітай змагаркі знайшла ўвасабленне ў апавяданні Наталлі Мацейчык “Графіня”. Пачынаецца твор з абмалёўкі апошніх эпізодаў жыцця Эміліі Плятэр, калі яна, як адзначае аўтар, не першы месяц хавалася ад царскіх атрадаў у доме спачуваючых паўстанцам людзей. Пры пабудове апавядання Н. Мацейчык карыстаецца прыёмам рэтраспекцыі: успаміны хворай Эміліі датычацца розных этапаў яе жыцця. З пераліку рэтраспектыўных эпізодаў заслугоўваюць увагі ўспаміны, звязаныя з юнацтвам, – перыядам выпрацоўкі характару. Менавіта там *“засталіся частыя верхавыя прагулкі, урокі фехтавання, летнія чаяпіцці на балконе, доўгія гадзіны, праведзеныя ў бібліятэцы за кнігамі…”* [6, с. 11].

Акрамя звычайных для шляхецкага дому падзей прыватнага жыцця пісьменніца згадала зацікаўленасць Эміліі народнымі песнямі і, у прыватнасці, галашэннямі. Тэкст апавядання дазваляе сцвярджаць, што пры стварэнні вобраза Плятэр пісьменніца абапіралася на вядомыя біяграфічныя звесткі пра гераіню. Так, факт зацікаўленасці фальклорам маладой паненкай пацверджаны мемуарамі жыхара Віцебска Максіміліяна Маркса [1]. Мемуарыст узгадваў пра Эмілію: *“Яна першай […] з запалам, уласцівым чулым і шляхетным сэрцам, душой аддалася беларускаму люду, вывучала яго беды і спачувала яму, імкнучыся, па магчымасці, аблегчыць яго лёс, збірала і спявала яго песні, добра плаціла за іх дастаўку і спрабавала сваё пяро ў наследаванні ім. На фартэпіяна яна магла вельмі падобна перадаць і радасць, і сум народных матываў, і нават тэмбры сапрана-жалейкі і баса-дуды”* [1, с. 143]. Гэту здольнасць адчуваць народную паэзію, эмацыянальнасць, чуласць, экспрэсію Н. Мацейчык падкрэсліла пры абмалёўцы гераіні апавядання.

Адзначым, што вобраз Эміліі Плятэр у беларускай пісьменніцы адрозніваецца ад традыцыйнага бачання іншымі аўтарамі. У першую чаргу, Н. Мацейчык надала ўвагу жаноцкасці маладой паненкі. На думку аўтара, стройная і далікатная Эмілія *“у доўгай шаўковай сукенцы з ружай у валасах”* танцавала на балі ў Вільні. Думаецца, пры стварэнні гэтага эпізода-ўспаміна пісьменніца кіравалася традыцыйным, шаблонным прыёмам: дэталі эпохі рамантызму (ружа ў валасах, доўгая

бальная сукенка, мармуровыя калоны бальнай салі, вальс і г.д.) ствараюць добра пазнавальны чытачом вобраз дзяўчыны “à la Natalie Rostova”. Прыехаўшы дадому, Эмілія коратка абрэзала валасы, што сімвалізуе яе адыход ад жаночай сутнасці і першы крок да змагання. Як вядома, мастацкая дэталь (апісанне інтэр’ера, пейзажа, знешнасці героя, яго маўлення) дапамагае дакладна асэнсаваць вобраз і ідэю твора. У дадзеным выпадку змена бальнай сукенкі на вайсковы мундзір сімвалізуе змену шляху для гераіні. Мэта яе жыцця – служыць айчыне, менавіта да гэтага Эмілія рыхтавалася з юнацтва.

Наступныя падзеі Н. Мацейчык перадае блізка да гісторыі паўстання (згадваецца атака на паштовую станцыю Даўгель, далучэнне атрада Эміліі да войска генерала Хлапоўскага, атрыманне вайсковага звання капітана). Аўтар не спыніўся толькі на абмалёўцы змагарскай дзейнасці Э. Плятэр, у апавяданне ўключаны эпізод запрашэння княгіняй Ганнай Кавальскай Эміліі на баль у гонар апошняй. Зноў пісьменніца падкрэслівае жаноцкасць вобраза: перад Эміліяй некалькі дзясяткаў бальных сукенак, сярод якіх яна выбірае сабе адзенне. Дэталі, якія выкарыстоўвае Н. Мацейчык, датычацца сэнсарнага ўспрымання: дотык шаўковай тканіны колеру *“няспелай алівы”* да скуры, святло і гук утульнай залы, бесперапыннае кружэнне пад музыку вальса. *“Дзяўчыну ахапіла бесклапотнасць, ёй здавалася, што гэты баль будзе доўжыцца вечна”*, – так пазначае псіхалагічны стан гераіні пісьменніца. Прыём кантрасту эпізодаў дапаўняе мастацкі інструментарый аўтара, эпізод “міру” змяняецца ваенным (чарговая бітва, атрыманае раненне). Верны спадарожнік графіні Люцыян суправаджае непрытомную Эмілію ў дом Марыі Абламовіч, які стане апошнім прытулкам Плятэр.

Сыходзячы з вобразнага, а таксама сюжэтна-кампазіцыйнага аналізу апавядання Н. Мацейчык “Графіня”, можна сцвярджаць, што вобраз Эміліі Плятэр быў распрацаваны аўтарам у традыцыі рамантычнай эстэтыкі. Асноўны прыём, выкарыстаны пісьменніцай, – кантраст падзей, дэталяў, псіхалагічнага стану гераіні. Адчуваецца, што абставіны *прымусілі* Эмілію забыцца на звычайныя для жанчыны паводзіны, паўстанне нібы *вымагае* гераіню адмовіцца ад сваёй прыроды, што можа разумецца як творчая фантазія аўтара.

Класікай беларускай і польскай літаратуры стаў твор А. Міцкевіча “Смерць палкоўніка”, прысвечаны падзеям Лістападаўскага паўстання 1830–1831 гг. У вершы апісана развітанне паўстанцкага атрада з загінуўшым камандзірам, аднак напрыканцы твора становіцца зразумелым, што кіраўніком паўстанцаў была дзяўчына. Абапіраючыся на тэорыю архетыпаў К. Юнга, У. Жылко выказала меркаванне пра выяўленне ў вершы А. Міцкевіча “Смерць палкоўніка” архетыпу анімус – *“унутранага вобразу мужчыны ў жанчыне, яе несвядомага маскулінага боку”* [7, с. 41]. Даследчыца лічыць, што як і іншыя архетыпы, анімус бярэ пачатак у глыбінных структурах псіхікі чалавека, калі мужчыны і жанчыны засвойвалі эмацыянальны вопыт і паводзіны супрацьлеглага полу. Адзначым, што у вершы А. Міцкевіча Эмілія названа *ліцвінкай*, яна паказана перш за усё ваяром, мужную смерць якога аплакваюць нават мужчыны.

Польскі празаік Вацлаў Гансяроўскі прысвяціў асэнсаванню асобы Эміліі Плятэр аднайменны раман [8], які стаў першым у польскай літаратуры гістарычным белетрызаваным выкладам падзей, звязаных з лёсам Плятэр. Паказальна, што першае выданне 1910 г. [8] якасна адрозніваецца ад другога выдання 1929 года [9]. Так, аўтар пашырыў твор, далучыўшы да яго апісанне паўстання ў Ашмянах і жорсткай расправы з ашмянцамі (часткі XIII–XVI). У 1908 г. В. Гансяроўскі правёў значную працу па зборы звестак пра Эмілію Плятэр, пералік асоб, якія дапамаглі пісьменніку факталагічнай інфармацыяй, размешчаны напрыканцы першага выдання кнігі.

Як адзначыў аўтар, з дзяцінства Эмілія вылучалася чулай душой, эмпатыяй, была не па гадах сур’ёзнай, шмат чытала, займалася матэматыкай. Паказальна сяброўства паненкі са старым салдатам Мурашкам, які шмат апавядаў дзяўчыне пра вайсковыя падзеі, у якіх браў удзел. Дэталёва паказаны характар Плятэр у стасунках з маладым шляхцічам Гружэўскім. Першае з’яўленне Эміліі ў творы аздоблена арэолам рамантызацыі і эстэтызацыі: лёгкая непрыкметная постаць дзяўчыны, утвораная нібы з пылка сонечных промняў, плыве над натоўпам, які, падобна жытнёвым хвалям, кратнутым ветрам, расступаецца перад ёю [8, с. 38].

Пісьменнік дэталізуе партрэт гераіні, акцэнтуе ўвагу на знешнасці (*зграбны стройны стан амазонкі, залаціста-папялістыя валасы*) і апісанні вачэй Эміліі (*вялікія, сумныя, задуменныя*). У той жа час з вуснаў аднаго з герояў гучыць іранічная характарыстыка гераіні: *“Панна Эмілія Плятэр, дачка графа Плятэра, афіцэрская змейка! Чатырох паручнікаў засушыла, зрабіла трубадурам генерала, каменданта крэпасці, прывабіла ўвесь штаб другой дывізіі. А цяпер артылерыйскага капітана, барона, гатуе сабе, галубочка, на мужа”* (тут і далей пераклад наш. – *Г.Г.*) [8, с. 39]. Сімвалічным бачыцца эпізод сустрэчы пана Гружэўскага і лікснянскай паненкі: конь Эміліі зрываецца ў водную віхуру Дзвіны, і малады паніч ратуе дзяўчыну. Сутыкненне са смяротнай небяспекай будзе суправаджаць Эмілію да канца жыцця, ахвяраванне сабой дзеля іншых, дзеля высакароднай мэты прадвызначыць далейшы лёс гераіні.

В. Гансяроўскі матываваў выбар Эміліяй шляху барацьбы характарам дзяўчыны, якая вольны час прысвячала кнігам, музыцы, вывучэнню гісторыі, верхавым паездкам, наведванню сялянскіх хат: *“Пад чарамі таго таямнічага заклiку абуджалася цікавасць да спраў айчыны, апантанасць мужнасцю, адраджэннем, геройствам. Гэты покліч схіляў калені графіні перад выявай Арлеанскай Дзевы…”* [8, с. 184]. Пісьменнік улічыў розныя аспекты сталення асобы Эміліі. Так, аўтару бачыцца важным не толькі самаадукацыя графіні, але і той факт, што Эмілія не мела апоры ў асобе бацькі, які рана пакінуў сям’ю і жыў з другой жонкай. Глыбока схаваныя перажыванні не маглі не адбіцца на светаразуменні Эміліі, пасля су-

стрэчы з бацькам непрыемна ўражаная дзяўчына траціць на момант сілу духа і толькі весткі пра пачатак паўстання ў Варшаве вяртаюць гераіню да дзейнасці.

Падзеі на Літве актывізуюцца напрыканцы студзеня 1831 г., род Плятэраў з'язджаецца на фамільны з'езд, на якім старэйшыя прадстаўнікі дынастыі раяцца асобна ад моладзі, гатовай да актыўнага ўдзелу ў паўстанні.

Адзначым, што ў рамане Гансяроўскага галоўная гераіня паступова вырастае да вобраза-сімвала прагрэсіўна настроенай патрыёткі, для якой галоўнае не амбіцыі, а шчасце народа, надыход лепшых часоў, калі будзе *"менш нядолі і менш сірот"*. Эмілія адчувае хуткае здзяйсненне самых неверагодных мар, калі *"пасля гадоў змроку ёсць магчымасць абудзіцца да волі, мець перад сабой неахопныя прасторы для плённай працы"* [8, с. 233]. Кульмінацыйным эпізодам рамана становіцца прыняцце Эміліяй рашэння не спадзявацца на дапамогу знешніх сіл, а распачынаць змаганне самастойна: *"Мы тут на ўскрайку Літвы не ведаем, што робіцца пад Коўна, Гродна, Наваградкам"* [8, с. 259]. За такім выбарам бачыцца не стыхійная гарачнасць, рашэнне было абдуманым і прынятым пасля таго, як зніклі спадзяванні на знешнюю падтрымку.

Як паведамляе аўтар, Эмілія не была фармальнай фігурай у паўстанцкім атрадзе, яна кантралявала пытанні, якія датычыліся зброі, фуражу, аховы атрада, разведкі, практыкаванняў і інш. Праз успрыманне аднаго з герояў Эмілія бачыцца вопытным ваяром: *"Перад ім была не дзяўчына – палкоўнік. Не ўздрыгне, сыпе, як з рукава, інструкцыямі, памятае пра кожную дробязь, рыхтуецца да паходу, клапоціцца пра параненых, коней, намячае бліжэйшыя пункты для разведкі, камандуе, хто ідзе сярод першых, хто ў ар'ергардзе, разлічвае склад атрадаў і ведае кожнага паўстанца па імені і прозвішчу"* [9, с. 276]. Эмілія разумела сур'ёзны недахоп паўстання – яго раздробленасць. Таму на нарадзе прымала рашэнне пра злучэнне атрада з іншымі паўстанцкімі сіламі ашмянскага краю.

Высакароднасць гераіні дэманструе яе рашэнне адпускаць палонных пад слова гонару не ваяваць супраць паўстанцаў. Патэтыкай насычаны адказ Эміліі Дальвігу на пытанне пра пагрозу смерці: *"Калі не суджана нам здабыць свабоду, хай з крыві і попелу нашага народзяцца новыя сілы, каб з магіл ішоў да людзей заклік да вызвалення"* [8, с. 304]. Эмілія назвала сябе адарванай кветкай, якой суджана завянуць на прыступках да помніка свабоды. Сімволіка параўнання відавочная: жыццё ахвяруецца дзеля найвышэйшай каштоўнасці – свабоды айчыны.

Паказальна, што ў рамане закранаецца праблема стаўлення да жанчыны ў тагачасным грамадстве. Успрыманне яе ролі (нарачоная, жонка, гаспадыня, маці і г.д.) было традыцыйным, таму вылучэнне Эміліі за межы свайго жаночага стану не ўсімі разумелася і прымалася.

Заканчвае раман аповед пра пахаванне лікснянскай паненкі Эміліі Плятэр у вайсковай вопратцы з палашом.

**Заключэнне.** Вобраз Эміліі Плятэр быў ідэалізаваны ў літаратуры і іншых відах мастацтва. З параўнальнага аналізу вобраза гераіні ў творах беларускай і польскай літаратуры вынікае, што польскія пісьменнікі бачылі ў асобе Плятэр сімвал адраджэння, насычалі апісанні рамантычнымі дэталямі, падкрэслівалі ў характары гераіні патрыятызм і самаахвярнасць. Разам з гэтым назіраецца розная ступень мастацкай інтэрпрэтацыі фактаў біяграфіі і ходу паўстання. Так, у апавяданні Н. Мацейчык "Графіня" заўважаны адыход ад фактвлогіі ў фінале твора: Эмілія памірае, так і не даведаўшыся пра паражэнне паўстанцаў, аднак, як сведчаць гістарычныя і біяграфічныя крыніцы, менавіта вестка пра разгром апошніх паўстанцкіх атрадаў канчаткова падарвала сілы Плятэр. Н. Мацейчык зрабіла вобраз Эміліі больш вытанчаным, далікатным, гераіня бачыцца дзяўчынай, якую абставіны *вымушаюць* змяніць лінію паводзін. У творах А. Міцкевіча і В. Гансяроўскага "жаноцкасць" вобраза зводзіцца да мінімума, на першы план выходзяць прафесійныя навыкі і ваенны вопыт гераіні. Акрамя гэтага, польскі празаік Гансяроўскі грунтоўна абапіраўся на дакументы, яго твор вылучаецца большай блізкасцю да фактаў, акрамя Эміліі, у рамане дзейнічаюць і іншыя рэальныя асобы – Юліўш Гружэўскі, Марыя Рашановіч і інш.

Асоба Эміліі Плятэр працягвае асэнсоўвацца сучаснымі пісьменнікамі, што даказвае, напрыклад, публікацыя гістарычнага рамана М. Галдзянкова "Я – Эмилия Плятер" (2019). Гэта сведчыць пра ўзбагачэнне нацыянальнай гістарычнай літаратуры новымі варыянтамі мастацкага асэнсавання беларускай мінуўшчыны.

## Літаратура


1. Маркс, М. Эмілія Плятэр / М. Маркс // Віцебскі сшытак: гіст. навук.-папул. часоп.; гал. рэд. Л. Хмяльніцкая. – Віцебск. – 2017. – Вып. 5. – С. 143–144.
2. Навасельцава, Г.В. Мастацкае ўвасабленне мінулага ў творчасці рускамоўных пісьменнікаў / Г.В. Навасельцава // Учёные записки. – 2011. – № 12. – С. 205–210. URL: https://rep.vsu.by/bitstream/123456789/5035/5/t12pub205.pdf (дата звароту: 09.09.2022).
3. Плавінскі, М.А. Гісторыя Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі: вучэб.-метад. дапаможнік / М.А. Плавінскі. – Мінск: ІВЦ Мінфіна, 2017. – 107 с.
4. Швед, В.В. Паміж Польшчай і Расіяй: грамадска-палітычнае жыццё на землях Беларусі (1772–1863) / В.В. Швед. – Гродна: ГрДУ, 2001. – 416 с.
5. Арлоў, У. Імёны свабоды / У. Арлоў. – Радыё Свабода, 2007. – С. 36–37.
6. Мацейчык, Н. Графіня / Н. Мацейчык // Маладосць. – 2012. – № 2. – С. 10–13.
7. Жылко, У. Рэпрэзентацыя архетыпаў у жаночых вобразах беларускай мастацкай культуры XIX стагоддзя (на прыкладзе літаратуры і жывапісу) / У. Жылко // Государства Центральной и Восточной Европы в исторической перспективе: сб. науч. ст. – Пинск, 2017. – Вып. 2. – С. 33–41.
8. Gąsiorowski, W. Emilia Plater: powieść historyczna z XIX wieku / W. Gąsiorowski. – Warszawa: Druk i nakład Tow. Akc. S. Orgelbranda S-ów, 1910. – 366 s.
9. Gąsiorowski, W. Emilia Plater: powieść historyczna z XIX wieku / W. Gąsiorowski. – Warszawa: Dom książki polskiej, 1929. – 398 s.


*Паступіў у рэдакцыю 08.09.2022*